[14] В Славянском фонде Библиотеки РАН этот вид периодики учитывается как журналы.

[15] Гісторыя беларускай кнігі. У 2 т. Т. 2. Кніжнасць новай Беларусі (XIX–XXI стст.) / М.В. Нікаласў [і інш.; навук. рэд.: В.В. Антонаў, М.В. Нікалаеў. Мінск, 2011. С. 107.

[16] Вацлав Леон Маковский (1854–1929) – книготорговец в Вильно, общественный деятель.

[17] В изд.: Вся Вильна: адресная и справочная книга гор. Вильны. 1914 год. Вильна: Тип. А.Г. Сыркина, 1914. Изд. VI. С. 258.

[18] Книжный магазин В. Маковского, как филиал виленского, открылся в Минске в 1900 г. Здесь, помимо польской литературы, можно было приобрести и белорусскоязычные книги на кириллице и латинице, однако после ревизии 1910 г. белорусские книги были конфискованы (*Шыбека З.В.* Минскъ сто гадоў таму. Мінск, 2007. С. 150–151).

[19] Известно не менее 60 изданий на белорусском языке, вышедших в типографии М. Кухты на протяжении 1906–1915 гг. (Гісторыя беларускай кнігі. У 2 т. Т. 2. Кніжнасць новай Беларусі (XIX–XXI стст.) / М.В. Нікалаеў [і інш.]; навук. рэд.: В.В. Антонаў, М.В. Нікалаеў. Мінск, 2011. С. 52).

*Л.І. Доўнар*

## «Квадратура круга» ў кнігазнаўстве

У артыкуле аўтар падымае праблемныя пытанні кнігазнаўства, якія разглядаюцца ў кантэксце гуманізацыі грамадства. Выдзяляецца грамадска-дзяржаўная праблема ўзаемадзеяння навукі, культуры, адукацыі.

*Ключавыя словы*: кнігазнаўства, гуманітарныя навукі, міждысцыплінарнае ўзаемадзеянне.

*Л.И. Довнар*

## «Квадратура круга» в книговедении

В статье автор поднимает проблемные вопросы книговедения, которые рассматриваются в контексте гуманизации общества. Выделяется общественно-государственная проблема взаимодействия науки, культуры, образования.

*Ключевые слова*: книговедение, гуманитарные науки, междисциплинарное взаимодействие.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*L.I. Doŭnar*

# «Squaring the Circle» in Bibliology

In the article the author raises issues of bibliology, which are discussed in the context of humanization of society. The author examines the social and state problem of interaction between science, culture and education.

*Keywords*: bibliology, Humanities, interdisciplinary interaction.

Квадратура круга паводле «Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы» – гэта *1) невырашальная задача ператварэння круга ў роўнавялікі квадрат; 2) наогул невырашальная задача*; а таксама ў матэматыцы, дзе ўсё дакладна, квадратура (толькі) – гэта *вылічэнне плошчы або паверхні фігуры*[1]. І, як не дзіўна, змест кожнага з прыведзеных значэнняў можа падыходзіць да таго, каб акрэсліць кола адных з галоўнейшых тэарэтыка-метадалагічных праблем кнігазнаўства, як аб'ект, састаў, структура, аб'ём, межы, азначэнне навукі і ці вызначальныя яны наогул, раз і назаўсёды?

Аднак, і ці да месца падобная метафара, калі кнігазнаўцы ўжо не першае дзесяцігоддзе б'юць у набат[2]: пад пагрозай не толькі наяўнасць самой навукі (паглынанне іншымі, распад комплекснасці – адлучэнне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства, элімінацыя?), але і здароўе грамадства[3] – духоўнае, маральнае. Як павінна змяніцца навука пра кнігу, каб быць запатрабаванай? Ці мае ўнутраную гатоўнасць да новай парадыгмы і якой? Ці стане выхадам з кагнітыўнага дысанансу постнекласічная рацыянальнасць з пазнаннем модульнага тыпу, праблемна арыентаваным на «штурм» тых ці іншых пытанняў? Ці ў стане навука (у тым ліку пра кнігу) ўзяць адказнасць і паставіць перад сабой задачу гуманізацыі грамадства, ажыццявіўшы на практыцы сістэмныя змены ў трыўмвіраце, у які сама і ўваходзіць: «навука – культура – адукацыя»?

Як лічыць паважаны і мудры вучоны А.В. Сакалоў, вырашэнне праблемы гуманізацыі грамадства – «*цель книговедческой науки и практики, информационно-компьютерные технологии – средства достижения этой цели*»[4]. Г.М. Швяцова-Водка, не менш паважаны навуковец, якая таксама, як і А.В. Сакалоў, кампрамісы спрабуе адшукаць яшчэ і ў канструяванні тэарэтыка-метадалагічных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мадэляў навуковых ведаў, засноўваючыся на тэорыі сацыяльнай інфармацыйнай камунікацыі[5] – хоць і скептычна ўспрымае данае палажэнне гуманізацыі (Расіі), тым не менш ўдакладняе, што «〈…〉*цель должна быть поставлена прежде всего перед политиками, государственными деятелями, в том числе руководителями книжного дела и народного образования. А библиологические науки должны способствовать выяснению путей и способов осуществления этой благородной задачи*»[6].

Дыскусія, разгорнутая апошнім часам, дзякуючы К.М. Сухарукаву[7], на старонках вядомага навуковага выдання «Книга. Исследования и материалы» (2012–2014), на наш погляд, павінна стаць не толькі дыскусіяй дзеля дыскусіі і пацвердзіць жыццяздзейнасць навуковых ведаў кнігазнаўства, бібліялогіі, а таксама стымуляваць да вырашэння сур'ёзных праблем як кніжнай справы і культуры, так і адукацыі, у якіх менавіта дзяржаве трэба выступаць самым зацікаўленым і адказным сістэмным суб'ектам-арганізатарам.

Але… Краіны з постсавецкай прасторы, для якіх сферы культуры і адукацыі – гэта найперш ідэалагічныя «муры» (у мінулым), а сёння, калі на ўсіх можна «накінуць» і маніпуляцыйную сетку СМІ, нават не зважаючы на трухлявасць «муроў», то што павінна здарыцца, каб дзяржава стала сапраўдным, а не дэкларатыўным саюзнікам навукі – культуры – адукацыі на шляху да гуманізацыі грамадства?

Значны патэнцыял кнігазнаўчых ведаў і намаганняў з надзеяй скіраваны да такой навуковай катэгорыі як кніжная культура[8], якая разглядаецца як самастойны міждысцыплінарны навуковы кірунак ці бібліялагічная парадыгма і дазваляе па-новаму ацаніць і выйсці на іншы ўзровень асэнсавання і пазнання кнігі, у тым ліку і кніжнай камунікацыі; «〈…〉 *интегрированно исследовать мир книг как своего рода целостную систему*»[9], а супастаўляючы з іншымі з'явамі культуры – паказаць значымасць кніжнай культуры для развіцця цывілізацыі, сёння яшчэ не поўнасцю ацэненую[10]. Сусветнавядомымі вучонымі У.І. Васільевым і К. Міганем прадстаўлены таксама і распрацаваныя імі тэарэтычныя мадэлі кніжнай культуры: адпаведна – шматузроўневая і «колавая», якія адкрыты для абмеркавання, далейшага раскрыцця, напаўнення і ўвасаблення. А, як лічыць Г.М. Швяцова-Водка «〈…〉 *практически без полемики «книжная культура» заменила «книжное дело» в обозначении сложного объекта всех взаимосвязанных библиологических дисциплин*»[11].

Таму, відаць, у новай трактоўцы саставу бібліялогіі Г.М. Швяцова-Водка і прапаноўвае ў якасці прыватнай дысцыпліны ў складзе бібліясофіі (метанавукі для дысцыплін бібліялагічнага комплексу) «культуралогію кнігі»[12].

Варта засяродзіць увагу ў даным кантэксце і на аксіялагічным падыходзе, а дакладней нават маральна-каштоўнасным, якім вызначаюцца працы, напрыклад, М.В. Нікалаева і Л. Ляўшун, іх навуковыя напрацоўкі таксама з'яўляюцца неабходным метадалагічным інструментарыем кнігазнаўцаў, бо «⟨...⟩ *определение адекватных семантического, и шире – герменевтического пространств понятия «книга" по возможности в полном их объеме дает необходимую перспективу для восприятия и изучения как средневековой, так и современной культур слова и объясняет одинаково характерную для обеих и тем роднящую их любовь к «почитанию книжному»*[13]. Галоўным у прадмеце кніжнай культуры, паводле М.В. Нікалаева, з'яўляецца кніга як каштоўнасць, у тым ліку як маральная каштоўнасць[14], што адлюстроўвае яе катэгарыяльны імператыў. Таму кніга – гэта не толькі феномен, а яшчэ і ноумен («рэч сама ў сабе»), што варта браць пад увагу пры канструяванні яе азначэння, як сістэмнага аб'екта кнігазнаўства, бібліялогіі, раскрываючы сутнасць фенаменалагічнай канцэпцыі.

У развіцці навукі пра кнігу, як адзначае К. Мігань, «⟨...⟩ *появился новый, обоснованный и необходимый элемент, который логично дополняет всю структуру современной науки о книге (библиологии)*» – гэта гісторыя кнігазнаўства[15]. І робіць падсумаванне, што «⟨...⟩ *без особого учёта исторического опыта дисциплины непонятны закономерности развития книговедческой мысли, невозможно проследить влияния, определить дальнейшие исследовательские перспективы, исчезают связи между поколениями учёных, рвётся традиция и появляются препятствия для её продолжения; ученики лишаются возможности перенятия опыта исследователей-предшественников, поэтому постоянно допускают одни и те же ошибки* ⟨...⟩».

Такім чынам, «квадратура» даследчай плошчы кнігазнаўства ніякім чынам не змяншаецца, а пераходзіць на іншы ўзровень (узроўні) асэнсавання, яго ж асноўнай характарыстыкай з'яўляецца, як слушна прадстаўляе А.В. Сакалоў, «*многомерность*»[16], шматмернасць як структуры, так і ўзаемасувязяў усіх элементаў – цалкам сістэмы. Адпаведна, кнігазнаўства (бібліялогія), як прапануе А.В. Сакалоў, – структураваная сістэма фундаментальных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і прыкладных ведаў, размеркаваных па навуковых дысцыплінах у залежнасці ад узроўню лагічнага абагульнення.

Не менш значнай сістэмай, якая пераводзіць кніжныя веды з грамадскіх у індывідуальныя каштоўнасці, з'яўляецца сфера адукацыі і выхавання. Аднак у гэтай сферы, як адзначаюць сучасныя кнігазнаўцы, адбыўся «⟨...⟩ *«сбой» в культурной эстафете поколоений – не только и не столько из-за разницы интересов и моделей чтения «отцов» и «детей», сколько вследствие деградации школьного и вузовского преподавания, особенно гуманитарных предметов,* ⟨...⟩ *люди перестали стыдиться своего невежества*»[17].

Адначасова, у педагогіцы ў якасці навуковых механізмаў разглядаюцца, напрыклад, наступныя: культуралагічны падыход як метадалагічная аснова пры распрацоўцы зместу выхавання, гуманізацыя і фундаменталізацыя зместу адукацыі на аснове міждысцыплінарнага падыхода[18]. Аднак, пытанне якім чынам павінна быць уключанай у гэты працэс кніга – застаецца адкрытым, як і ўмацаванне сацыяльнага прэстыжу кнігі і кніжнай камунікацыі.

Ці вырашальныя на практыцы пытанні міждысцыплінарнага ўзаемадзеяння і дзяржаўнага рэгулявання данымі працэсамі гуманізацыі грамадства? Гэта зусім не значыць, што акрэсленае кола праблем магчыма вырашыць выпростваннем яго (кола) ў інтэграцыйны чатырохкутнік «дзяржава – навука – культура – адукацыя», але ўсё ж стратэгічная вось канцэпцыі бачыцца ў падобным грамадска-дзяржаўным звязку, які, магчыма, дае шанцы і на іншыя падыходы да распрацоўкі метатэорыі кнігазнаўства (бібліялогіі), чым тыя, што на сёння прапануюцца.

[1] Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко. 2-е выд. Мінск, 1999. С. 287.

[2] Напр.: *Ельников М.П.* Книговедение как наука: от шестидесятых к двухтысячным // Книга. Исследования и материалы. М., 2002. Сб. 80. С. 161–185; *Леонов В.П.* 1) О библиотечных мифах // Библиотековедение. 2006. № 6. С. 29–30; 2) О гравитации печатной и электронной книги // Книга. Исследования и материалы. М., 2014. Сб. 100. С. 61–69; *Лютов С.Н.* Наука о книге в начале XXI в.: время компромиссов // Берковские чтения. Книжная культура в контексте международных контактов: материалы Междунар. науч. конф. (Минск, 25–26 мая 2011 г.). Минск; М., 2011. С. 220–223; *Соколов А.В.* 1) Кому нужны библиотеки в XXI веке? // Библиотековедение. 2006. № 6. С. 27–29; 2) Многомерная структура книговедческого знания // Книга. Исследования и материалы. М., 2012. Сб. 98–99. С. 13–29; 3) Философия информации: проф.-мировоззрен. учеб. по-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

собие. СПб., 2010; *Сухоруков К.М.* 1) Вместе или поразнь: о теории и практике книговедения // Книга. Исследования и материалы. М., 2012. Сб. 95. С. 5–23; 2) Наше книговедение: теория, мечты и реалии // Там же. 2014. Сб. 101. С. 48–59.

[3] *Соколов А.В.* 1) Кому нужны библиотеки в XXI веке? // Библиотековедение. 2006. № 6. С. 27–29; 2) Многомерная структура книговедческого знания // Книга. Исследования и материалы. М., 2012. Сб. 98–99. С. 13–29.

[4] Там же. С. 29.

[5] *Швецова-Водка Г.Н.* Наука о книге в XXI в.: старые споры и новые проблемы // Книга. Исследования и материалы. М., 2013. Сб. 99, ч. 3–4. С. 21.

[6] Там же. С. 23.

[7] *Сухоруков К.М.* 1) Вместе или порознь: о теории и практике книговедения // Книга. Исследования и материалы. М., 2012. Сб. 95. С. 5–23; 2) Наше книговедение: теория, мечты и реалии // Там же. 2014. Сб. 101. С. 48–59.

[8] Напр.: *Васильев В.И.* Книга и книжная культура на переломных этапах истории России. Теория. История. Современность. М., 2005; *Міганъ К.* 1) Кніжная культура – спроба акрэслення паняцця як навуковай катэгорыі / пер. Л. Доўнар // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: зб. навук. прац. Мінск, 2011. Вып. 3. С. 17–39; 2) Стан сучаснага кнігазнаўства як навукі / пер. Л. Доўнар // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: зб. навук. арт. Мінск, 2008. Вып. 2. С. 10–38; *Сайко Е.А.* Книжная культура в процессе интеграции науки и образования: проблемы и тенденции // Книга. Исследования и материалы. М., 2014. Сб. 100. С. 46–54; *Самайлюк Т.А.* Кніжная культура: сучасныя тэндэнцыі навуковых даследаванняў // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: зб. навук. арт. Мінск, 2008. С. 39–47; *Migon K.* Парадигмы науки о книге двести лет назад и сегодня // Knygotyra. Vilnius, 2010. Vol. 54. P. 44–53.

[9] *Migon K.* О необходимости и пользе исследований по истории науки о книге: опыт науковедческого анализа // Knygotyra. Vilnius, 2013. Vol. 60. P. 49.

[10] *Міганъ К.* Стан сучаснага кнігазнаўства як навукі / пер. Л. Доўнар // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: зб. навук. арт. Мінск, 2008. Вып. 2. С. 19.

[11] *Швецова-Водка Г.Н.* Наука о книге в XXI в. … С. 23.

[12] Там же. С. 18.

[13] *Левшун Л.* О смысле понятия «книга» в Кирилло-Мефодиевской традиции [Электронный ресурс]. URL: http://izdatsovet.by/v-pomoshh-provedeniyu-dnya-pravoslavnoj-knigi/o-smysle-ponyatiya-kniga-v-kirillo-mefodievskoj-tradicii.html (дата обращения: 23.02.2015).

[14] *Нікалаеў М.В.* Пачаткі кніжнай культуры Вялікага Княства Літоўскага // Спадчына. 2002. №5/6. С. 17.

[15] *Migon K.* О необходимости и пользе исследований … Р. 28.

[16] *Соколов А.В.* Многомерная структура книговедческого знания // Книга. Исследования и материалы. М., 2012. Сб. 98–99. С. 13–29.

[17] *Сухоруков К.М.* Наше книговедение: теория, мечты и реалии // Книга. Исследования и материалы. М., 2014. Сб. 101. С. 52.

[18] *Ушакова В.М.* Приоритеты педагогической науки в сфере культуры // Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва: матэрыялы навук. канф., Мінск, 28 лістап. 2013 г. Мінск, 2014. С. 191.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ